Н43

БИБЛИОТЕКА
БГУ

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

6 лютага 2008 года, № 2 (1974)

ПАДЗЕЯ

## ГРАНДЫЁЗНАЕ НАВАСЕЛЛЕ

***Нарэшце, доўгачаканая падзея! Пасля зімовых вакацый студэнты факультэтаў журналістыкі і філасофскіх і сацыяльных навук распачнуць свае заняткі ў новым вучэбным корпусе, размешчаным у цэнтры Мінска, недалёка ад метро. Прыгожы вялікі будынак стаіць паўкругам на скрыжаванні вуліц Кальварыйскай і Клары Цэткін.***



Будаваўся корпус універсітэта па праекце УП "Мінскпраект". Практычна ўся работа фінансавалася з рэспубліканскага бюджэту ў межах дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы. Толькі за апошнія два гады, калі вялося найбольш інтэнсіўнае будаўніцтва, на рэалізацыю праекта, разам з абсталяваннем і мэбляй, было выдаткавана больш за 50 млрд руб. На гэты аб'ект прыцягваліся самыя кваліфікаваныя кадры.

Будынак на Кальварыйскай з плошчай амаль 26 тыс. кв. м – другі па памеры пасля галоўнага корпуса (40 тыс. кв. м) ва універсітэце. Для параўнання – плошча Нацыянальнай бібліятэкі складае 50 тыс. кв. м.

Каля дзвюх з паловай тысяч студэнтаў у адну змену будуць займацца ў новым корпусе, дзе для іх створаны сапраўды камфортныя ўмовы. Тут размясціліся бібліятэка, медыятэка, 7 кампутарных класаў і 2 лінгафонныя кабінеты. Аўдыторыі і кафедры аснашчаны камплектамі вучэбнай і вылічальнай тэхнікі апошняга пакалення. Ёсць вялікая актавая зала (з пастановачным асвятленнем, электраакустыкай і прыладамі для відэапрэзентацый) на 360 пасадачных месцаў, якая можа выкарыстоўвацца і для правядзення лекцый або маштабных семінарскіх заняткаў. Даспадобы прыйдзецца і прасторная сталовая, разлічаная на 150 месцаў. Яшчэ ў корпусе маюцца дзве спартыўныя залы трэнажорнага тыпу.

Спрыяць падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў будзе сучаснае прафесійнае абсталяванне. Напрыклад, будучыя тэлежурналісты атрымалі для сваіх патрэбаў выдатна аснашчаны тэлецэнтр, які каштуе прыблізна 3,5 млн еўра. Вучэбна-вытворчая тэлестудыя размешчана ў прыбудове на 6–7 паверхах. Прадугледжаны таксама тэлепавільён плошчай 300 кв. м для правядзення здымкаў. На гэтай базе будзе ажыццяўляцца поўны цыкл: ад здымачнага працэсу і апрацоўкі пры дапамозе кампутарнай графікі да выпуску канчатковай прадукцыі.

Такім чынам, у будучых журналістаў, філосафаў і сацыёлагаў з'явіліся цудоўныя магчымасці для прафесійнага росту. Цяпер слова за студэнтамі, якія павінны добра вучыцца і на справе паказаць, што яны вартыя такіх выгод.

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
**Фота Аляксандра СНАПКА**

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**РАЗУМНЫМ БЫЦЬ ПРЭСТЫЖНА!**
З выступлення прарэктара па навуцы прафесара Уладзіміра ПАНЬКОВА на ўрачыстым пасяджэнні Вучонага савета БДУ, прысвечаным Дню беларускай навукі
Стар. 2

**"МЫ – КААРДЫНАТАРЫ І АРГАНІЗАТАРЫ НОВАБУДОЎЛЯЎ"**
Інтэрв'ю з кіраўніком Дырэкцыі будоўлі аб'ектаў (ДБА) БДУ Аляксандрам КАЗАКОМ, з нагоды 20-годдзя арганізацыі
Стар. 3

**ДОБРЫ АДПАЧЫНАК – ЗАКЛАД ПАСПЯХОВАЙ ВУЧОБЫ**
Уражанні нашых студэнтаў ад зімовых вакацый у САК "Брыганціна"
Стар. 4

ВІНШУЕМ!

## ПРЭЗІДЭНЦКІ АВАНС

***Ушанаванне лаўрэатаў Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў адбылося 25 студзеня на геаграфічным факультэце нашага універсітэта падчас урачыстага пасяджэння Вучонага савета БДУ, прымеркаванага да Дня беларускай навукі.***

Створаны ў 1996 годзе, Фонд матэрыяльна стымуляваў ужо больш за 15 тыс. чалавек. Летась яго праграмамі былі ахоплены 1752 чалавекі, агульная сума выдаткаваных сродкаў склала 855 млн руб. Старшыня Фонду Алена Бялова, якая віншавала юнакоў і дзяўчат, упэўнена: аддача ад інвеставаных у моладзь грошай будзе. Стыпендыяты мінулых гадоў ужо заявілі пра сябе – сталі кандыдатамі навук, занялі кіраўнічыя пасады ў розных галінах.



*Старшыня Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў Алена Бялова ўручае дыпломы стыпендыятам.*

Гэтым разам Фонд адзначыў 61 студэнта нашага універсітэта, якім былі ўручаны адпаведныя пасведчанні. У іх ліку пераможцы XIII Міжнароднай матэматычнай алімпіяды сярод студэнтаў ВНУ (Украіна, 2006 г.), Рэспубліканскай студэнцкай алімпіяды па матэматыцы (2006 г.), Рэспубліканскай алімпіяды па правазнаўстве (2007 г.), Рэспубліканскага конкурсу навуковых прац вышэйшых навучальных устаноў (2006 г.), а таксама студэнты, якія дасягнулі значных поспехаў у вучобе, навуковай і грамадскай дзейнасці. З іх нагрудныя значкі лаўрэатаў, а таксама паўнавартасныя стыпендыі ў выглядзе штомесячнай надбаўкі ў памеры 200 тыс. руб. атрымалі 8 найлепшых маладых навукоўцаў. Астатнім былі выдадзеныя прэміі ад 124 да 1240 тыс. руб. Акрамя таго, за значны асабісты ўнёсак у развіццё здольнасцяў таленавітай моладзі Фонд адзначыў дацэнта факультэта радыёфізікі і электронікі Івана Манака.

Пасля цырымоніі студэнты прызнаваліся, што яны працягвалі б свае карысныя заняткі і без узнагарод, але быць вылучаным і заахвочаным заўсёды прыемна. Хаця і адказна – давядзецца апраўдаць ускладзеныя на цябе спадзяванні.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**



## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

ДЭЛЕГАЦЫЯ Міністэрства адукацыі і навукі Літвы на чале з сакратаром міністэрства Лінай Дамаркене 25 студзеня наведала БДУ падчас свайго візіту ў Беларусь. Адбылася сусрэча з рэктарам прафесарам Васілём Стражавым, на якой абмеркаваліся пытанні, звязаныя з развіццём супрацоўніцтва ў галіне вышэйшай адукацыі.

ЗАГАДАМ рэктара з 1 лютага НІЧ і Галоўнае ўпраўленне навукі аб'яднаны ў адну структуру – "НІЧ-Галоўнае ўпраўленне навукі". Яе кіраўніком прызначана Таццяна Дзік. Са складу НІЧ–ГУН выдалены навукова-інавацыйны аддзел, які пераўтвораны ў самастойнае структурнае падраздзяленне – упраўленне навукова-інавацыйнай дзейнасцю – і падпарадкаваны прарэктару па эканоміцы, камерцыйнай і інвестыцыйнай дзейнасці. Намеснікам прарэктара прызначаны Уладзімір Панарадаў. Загад па рэарганізацыі прыняты ў мэтах павышэння эфектыўнасці арганізацыі фундаментальных і прыкладных даследаванняў, развіцця інавацыйнай дзейнасці комплекса БДУ.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

# РАЗУМНЫМ БЫЦЬ ПРЭСТЫЖНА!

## З выступлення прарэктара па навуцы прафесара Уладзіміра ПАНЬКОВА на ўрачыстым пасяджэнні Вучонага савета БДУ, прысвечаным Дню беларускай навукі

***Сучасныя тэндэнцыі***

Тэмп назапашвання ведаў сусветнай навуковай супольнасцю зараз надзвычай хуткі, існуе вельмі вялікая канкурэнцыя, а часавы інтэрвал, які дапускаецца паміж зробленым навуковым адкрыццём і яго прымяненнем, дужа малы. Таму сёння патрэбны спецыялісты, якія не толькі валодаюць ведамі, але і ўмеюць атрымліваць іх самастойна. Такія здольнасці фарміруюцца, як вядома, пры выкананні НДР. З іншага боку, і мы, настаўнікі моладзі, таксама павінны дасканала валодаць навыкамі назапашвання ведаў. Відавочна, што рыхтаваць сучасных спецыялістаў можна толькі пры ўмове ўдзелу ў навуковых даследаваннях.

*Слайд 1*




***Развіццё сістэмы навукі***

Гісторыя сведчыць, што развіццё БДУ і развіццё моладзевай навукі былі непарыўна звязаныя. Пасля цяжкіх 90-х гадоў студэнцкая навука патрабавала аднаўлення.

Як гэта бывае ў цяжкія моманты, позіркі скіроўваюцца да мацнейшага. Ім апынуўся наш універсітэт, на базе якога ў 1994 г. быў створаны Рэспубліканскі цэнтр каардынацыі НДРС.

Важную ролю ў пад'ёме навуковай творчасці моладзі адыграла стварэнне ў 1996 г. Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

У 1997 г. у БДУ з'явілася ўпраўленне падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, у структуру якога ўвайшоў аддзел НДРС. У тым жа годзе ўпраўленне ўпершыню наладзіла конкурс грантаў для студэнтаў і аспірантаў універсітэта. У 1998 г. нашую ініцыятыву падтрымала Міністэрства адукацыі.

Выбудавалася дакладная сістэма навуковай творчасці моладзі ад студэнцкай лаўкі да абароны дысертацыі (гл. слайд 1).

На слайдзе 2 мы бачым эфектыўнасць працы аспірантуры ва універсітэце.

Поспехі дасягнуты найперш дзякуючы высокай выкладчыцкай кваліфікацыі. Не апошнюю ролю адыгрывае ўласная сістэма матэрыяльнага стымулявання аспірантаў і іх навуковых кіраўнікоў. Яе характэрная асаблівасць – адраснасць падтрымкі і арыентацыя на вынік работы. Асноўныя мерапрыемствы ў рамках гэтай сістэмы паказаны на слайдзе 3.

*Слайд 2*




Аспіранты 2006 г., якія абаранілі дысертацыі ў тэрмін.

Асобна трэба адзначыць, што рэктар прыняў рашэнне прафінансаваць універсітэцкі конкурс грантаў для моладзі ў 2008 г. з Фонду развіцця БДУ.

Разам з тым, у нас яшчэ не вычарпаны ўсе магчымасці для актывізацыі падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў (гл. слайд 4).

*Слайд 3*




***Захады па прыцягненні моладзі да навукі***

У нас шмат маладых людзей, схільных да даследчай працы, і для іх трэба стварыць адпаведныя ўмовы. Вядома, што пасля I З'езда вучоных з'явіцца верагоднасць вылучэння часткі базавага бюджэтнага фінансавання для навуковых калектываў. Каб моладзь таксама магла прыняць у гэтым удзел, я хацеў бы прапанаваць стварэнне ў навуковых калектывах асобных груп, якія б працавалі ў адпаведнасці з навуковымі планамі арганізацый.

Прынцыповае патрабаванне: у такой групе павінны быць, напрыклад, два прафесары ці дактары навук, тры кандыдаты навук і столькі ж аспірантаў, а таксама чатыры студэнты. Гэта павінна матываваць прафесара на пошук маладых, таленавітых людзей, каб далучаць іх да свайго калектыву. І такім чынам маладыя атрымаюць фінансавую падтрымку.

Акрамя заробку, патрэбны добрыя ўмовы для працы, чыстыя сучасныя лабараторыі. Моладзь вельмі востра рэагуе на тое, у якім асяроддзі ёй жыць і працаваць.

Моцным штуршком з'яўляецца і працэс засваення сучаснага абсталявання. Тут нам трэба ўдасканальваць работу цэнтраў калектыўнага карыстання.

***Пажаданне маладым***

Імкніцеся як мага больш зрабіць адразу ў маладосці. Фактычна яшчэ ў аспірантуры неабходна ўзброіцца ідэяй, якую пасля трэба інтэнсіўна развіваць.

Нам патрэбны маладыя члены-карэспандэнты і акадэмікі, маладыя загадчыкі лабараторый і дырэктары інстытутаў. Як толькі з'яўляюцца сапраўды першакласныя працы маладога аўтара, яго варта адразу прасоўваць, а не чакаць, пакуль ён дасягне сталага ўзросту.

***Моладзевая навука – важная крыніца папаўнення і амаладжэння выкладчыцкіх кадраў***

За перыяд з 2003 г. па 2007 г. на пасады асістэнтаў і выкладчыкаў БДУ працаўладкавана 163 выпускнікі аспірантуры і колькасць выпускнікоў аспірантуры на выкладчыцкіх пасадах пастаянна расце (гл. слайд 5).

Мы павінны развіваць міжнародныя сувязі, але рабіць гэта ўсвядомлена. Не ператварацца ў пастаўшчыкаў кадраў за мяжу, а ўмець выкарыстоўваць партнёрскія кантакты ў сваіх мэтах.

*Слайд 4*




Юрыдычная алімпіяда–2007. Урачыстае адкрыццё (2 сакавіка).

Сама па сабе мабільнасць навуковых кадраў – з'ява пазітыўная, якая дазваляе навукоўцам засвойваць новыя метады, знаёміцца з працай вядучых навуковых груп. Навука становіцца ўсё больш і больш глабальнай, і часта аказваецца, што дарагое абсталяванне можа ствараца толькі ў рамках міжнароднай кааперацыі. У 2001–2007 гг. каля 450 магістрантаў і аспірантаў БДУ ўдзельнічалі ў розных формах міжнароднага супрацоўніцтва. З іх 180 наведалі Расію, 52 – Германію, болей за 40 – Польшу і Украіну, 30 – Нідэрланды і 16 – Чэхію.

Усяго ахоплена 27 краін.

***Падсумаванне***

Сёння ва універсітэце зроблена шмат для паспяховага правядзення навуковых даследаванняў і дасягнення сур'ёзных вынікаў.

Мы маем унікальную магчымасць далучыць маладых да дзейнасці навуковых школ для таго, каб яны сталі не толькі выдатнымі спецыялістамі, але і творчымі асобамі. Менавіта навука вучыць творчаму падыходу. Вашыя веды, набытыя ва універсітэце, і багаты досвед выкладчыкаў дазволяць вам стаць спецыялістамі, запатрабаванымі на сусветным рынку працы. І нават калі вы надалей не звяжаце свой лёс з навукай, навыкі навуковага падыходу дапамогуць вам вырашыць практычна любыя прафесійныя пытанні.

*Слайд 5*




### *Напрыканцы прывядзём некалькі выказванняў і парадаў выбітных вучоных нашага універсітэта:*

**Якая роля моладзі ў дзейнасці Вашага калектыву?**

- Краіна, любое грамадства можа развівацца толькі тады, калі ў ёй большы працэнт – навучэнцы, творчая моладзь. (*Акад. Ф. Капуцкі.*)

- Асабліва важная роля моладзі ў "прарыўных" напрамках. (*Чл.-кар. Ф. Камароў.*)

- Моладзь "не дае спакойна жыць". (*Праф. С. Мулярчык.*)

- 13/30. (*Чл.-кар. Ю. Харын.*)

- Моладзь – адзін са складальнікаў, без якога нічога не магчыма. (*Праф. С. Балашэнка.*)

- Без моладзі няма будучыні. (*Акад. А. Леснікові, праф. В. Анішчык, праф. М. Жураўкоў.*)

**Як Вы дасягнулі поспеху ў навуцы?**

- Дзякуючы таму, што чытаў і не будаваў амбіцыйных планаў на перспектыву. (*Акад. А. Лесніковіч.*)

- Дзякуючы працы, добрым настаўнікам, удаламу і ранняму выбару цікавага напрамку. (*Акад. Ф. Капуцкі.*)

- Таму што рухаўся, спатыкаўся, разбіваючы асобныя часткі цела, падымаўся, і толькі наперад! (*Чл.-кар. Ф. Камароў.*)

- Дзякуючы таму, што навука робіць жыццё цікавым і ўпрыгожвае яго. (*Праф. С. Мулярчык.*)

- Дзякуючы фізфаку. (*Праф. В. Анішчык.*)

- Дзякуючы настаўнікам, працы ў правільна абраным напрамку. (*Праф. М. Жураўкоў.*)

## УСТАНОВЫ



*Аляксандр КАЗАК:*

# "МЫ – КААРДЫНАТАРЫ І АРГАНІЗАТАРЫ НОВАБУДОЎЛЯЎ"

***Дырэкцыя будоўлі аб'ектаў БДУ – важная структура не толькі для нашага універсітэта, але і для ўсёй сталіцы. Пад яе кіраўніцтвам у Мінску ўзнікла шмат асаблівых збудаванняў. Толькі што ўведзены ў строй доўгачаканы вучэбны корпус на вуліцы Кальварыйскай. Сімвалічна, што гэта супала са святкаваннем 20-годдзя ДБА.***

Дарэчы, першым будынкам, да якога згаданая арганізацыя "прыклала руку", стаў узведзены ў 1989 г. вучэбна-спартыўны комплекс "Універсітэцкі". Потым было шмат іншых аб'ектаў. Пра напружаныя будні і плённую працу нашых будаўнікоў расказвае дырэктар ДБА БДУ Аляксандр КАЗАК:

– Дагэтуль намі "здадзена пад ключ" 13 аб'ектаў. Гэта значная лічба: кожныя паўтара года па будынку, бо паводле будаўнічых праектаў на адзін аб'ект адводзіцца 36 і болей месяцаў. Такія тэмпы сведчаць, што БДУ расце вельмі інтэнсіўна. Менавіта з-за вялікіх аб'ёмаў будоўлі і была створана наша Дырэкцыя. У нас адмысловы персанал. Нават калі мы прымаем на працу спецыяліста з сямігадовым стажам, то дадаткова яшчэ паўгода вучым яго на тэхнічнага наглядальніка. Ён атрымоўвае адпаведнае пасведчанне і нясе адказнасць за правільнасць афармлення і суправаджэння аб'екта, прымянення да яго расцэнак, выканання ўсяго аб'ёма работ. У нашым штаце 26 чалавек, якія працуюць у бухгалтэрыі, планава-эканамічным і каштарысна-дагаворным аддзелах, а таксама аддзелах арганізацыі будаўніцтва, матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. Мы выконваем увесь комплекс работ: атрымоўваем дазвол на праектаванне, самі кантралюем праектныя работы, заключаем дагавор з генпадрадчыкам, а ў далейшым займаемся суправаджэннем будаўніцтва да самага заключнага моманту – уводу і перадачы аб'екта ў эксплуатацыю. Мы з'яўляемся, па сутнасці, каардынатарамі і арганізатарамі новабудоўляў.

**– Аляксандр Канстанцінавіч, якія будынкі ўспамінаюцца з найбольшай цеплынёй?**

– Цікавай як будаўніку мне падаецца рэканструкцыя вучэбна-лабараторнага корпуса юрыдычнага факультэта па вул. Ленінградскай, 8. Рэканструкцыя – справа заўсёды больш складаная, чым новае будаўніцтва. Мы мусілі перапраектаваць старую каробку, каб упісацца ў існуючыя будаўнічыя нормы, якія пастаянна ўдасканальваюцца. Напрыклад, літаральна за месяц да адкрыцця юрфака мы перарабілі ўсю сістэму пажарнай сігналізацыі паводле новых правілаў, прынятых неўзабаве Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях. Без ніякіх скідак.

Вельмі адметным для нас стала будаўніцтва цеплавузла Спартыўна-аздараўленчага комплекса "Брыганціна" БДУ, што ў Радашковічах, дзе адпачываюць супрацоўнікі і студэнты універсітэта. Дагэтуль тут наогул не было ўласнай кацельні, і цеплаэнергію даводзілася экспартаваць з суседняга санаторыя, што, натуральна, прыводзіла да значных страт. Вырашылі пабудаваць кацельню, якая б працавала на нетрадыцыйным энергазберагальным паліве, а менавіта – на драўняным пілаванні. Наконт узвядзення такіх аб'ектаў існавала нават цэлая дзяржаўная праграма. І Камітэт па энергаэфектыўнасці пры Савеце Міністраў РБ прафінансаваў нам пастаўку катлоў. Будоўлю закончылі за рэкордна кароткі тэрмін: у снежні пачалі "ўгрызацца" ў глебу, а ўжо ў верасні аб'ект быў гатовы. У Камітэце былі задаволеныя якасцю выкананых работ. Нават прызналіся, што з усіх аналагічных кацельняў наша – самая добротная.



*Каркас вучэбнага корпуса БДУ на Прывакзальнай плошчы (восень 2007г.).*

Ну і Вучэбна-гасцінічны комплекс для інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі супрацоўнікаў устаноў юстыцыі па вул. Савецкай — ён важны не толькі для нашага універсітэта, але і для ўсяго горада. Гэта адзіны помнік архітэктуры неамадэрнізму, які захаваўся ў Мінску. Мы займаліся не проста рэканструкцыяй збудавання, а яго рэстаўрацыяй. Паколькі праца вялася з гістарычным аб'ектам, да яго адчувалася павышаная ўвага з боку органаў кантролю. Нават для таго, каб дэмантаваць адну цагліну, яе даводзілася спачатку фатаграфаваць, а потым ужо сведчыць, што для гэтага сапраўды ёсць падстава. Нас прымусілі паўтарыць і дзверы, і вокны такімі, якімі яны былі ў XIX стагоддзі. Будынак захавалі. На яго рэстаўрацыю было затрачана шмат сродкаў, якія паступалі, у асноўным, з рэспубліканскага бюджэту. Каля 800 млн руб. выдаткаваў сам універсітэт.

У 2002 г. ў строй уведзены фізічны факультэт. Гэта першая чарга рэканструкцыі галоўнага корпуса БДУ па прасп. Незалежнасці. У перспектыве – яшчэ 3 этапы. Да другога збіраемся прыступіць у 2008 г. Будынак існуе без капітальнага рамонту паўстагоддзя. Зразумела, што, пачынаючы ад драўляных каробак і да інжынерных сетак, усё выйшла з ужытку. Галоўны корпус – вельмі важны будынак, і рамантаваць яго 3–4 гады нам не дазволяць. Таму неабходна буйное фінансавае ўліванне, каб распачатыя работы хутка скончыць. Мы якраз яго і чакаем.



*Будынак ІППК суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі БДУ (вул. Савецкая, 14).*

**– Пачынаюцца заняткі ў новым вучэбным корпусе па вул. Кальварыйскай. Гэта прыемна не толькі для студэнтаў і выкладчыкаў, але і для вас – людзей, якія штодня "майстравалі" гэты будынак...**

– Для нас аб'ект на Кальварыйскай цікавы нестандартным архітэктурным рашэннем. Узвядзенне будынка пачалося яшчэ ў савецкі час. Спачатку ён належыў саюзнай арганізацыі НВА "Комплекс", а ў канцы 1990-х гадоў быў перададзены Белдзяржуніверсітэту. Актыўная фаза будаўніцтва пачалася прыкладна з 2003 года, а ў 2006-м аб'ект пад пільны кантроль узяло Міністэрства адукацыі. У канструяванне будынка былі ўкладзеныя значныя сродкі, што дазволіла, нарэшце, яго завяршыць. Не даведзеную да ладу "каробку" мы ўдала перапраектавалі пад уласныя патрэбы і цяпер будынак аснашчаны сучаснымі кампутарнымі сеткамі са складаным тэхналагічным абсталяваннем.

**– Як ажыццяўляецца будаўніцтва вучэбнага корпуса на Прывакзальнай плошчы?**

– Гэты корпус – трэці па памеры будынак БДУ. Яго унікальнасць у тым, што ўзводзіцца на адлегласці 90 см ад метро. Нам прыйшлося забурыць каля 1 тыс. паляў, каб узвесці падмурак. Пад самім будынкам мы адразу заклалі пешаходны пераход трэцяй перспектыўнай лініі метрапалітэна на глыбіні 21 м. Пазней горад атрымае гатовую частку падземнага тунэля, які звяжа новую лінію метро з ужо існуючай. Падчас праектавання нам давялося вырашаць праблему вібрачастот, якія ўзнікаюць ад руху паяздоў у метро. Паводле санітарных нормаў пэўная колькасць вібрачастот дрэнна ўплывае на чалавечы арганізм. Спачатку вялася гаворка аб тым, каб будынак быў поўнасцю разрэзаны гарызантальна па чацвёртым паверсе і стаяў на тысячы вібрападушын, якія б гасілі частоты. Такія ўмовы дыктаваў маскоўскі інстытут, што спецыялізуецца на вырашэні аналагічных праблем. Разам з айчынным НДІ мы аспрэчылі гэтую выснову і правялі новыя даследаванні, чым зберaглі каля мільёна еўра і захавалі чацвёрты паверх функцыянальным. Насамрэч шкодных для чалавека частот на станцыі метрапалітэна не аказалася, таму што поезд тут ці запавольвае хуткасць, спыняючыся, ці набірае яе.

Аб тым, якім чынам вучэбны корпус будзе ўпісвацца ў Прывакзальную плошчу, вяліся сур'ёзныя спрэчкі ў Камітэце па архітэктуры і будаўніцтве. Некаторыя лічылі, што будынак павінен стаць часткай прывакзальнага ансамбля. Іншыя, наадварот, разглядалі яго як частку універсітэта з уласцівымі адрозненнямі. Перамаглі апошнія. Як відаць, новы корпус мае авальную форму, замыкае універсітэцкі дворык і тым самым завяршае сабой гарадок БДУ. Галоўны фасад – гэта маналіт шкла шэра-блакітнага, люстранога колеру, якое будзе выконваць функцыі святлоадбівальніка, паколькі будынак знаходзіцца на сонечным баку.

У корпусе прадугледжана кандыцыяванне з арыгінальнай сістэмай "разумнага дома". На яго базе мяркуецца стварыць агульнауніверсітэцкую дыспетчарскую з магчымасцю кантраляваць усе сеткі энерга-, цепла- і водазабеспячэння ў БДУ. Увесці ў эксплуатацыю гэты будынак мы здолеем недзе ў верасні 2009 г.

**– Якія задачы ставіце на будучыню?**

– Зараз заканчваецца праектаванне галоўнага корпуса. Яшчэ сёлета пачнецца будаванне студэнцкага інтэрната на прасп. Дзяржынскага. У абсягу медуніверсітэта наогул будзе ўзводзіцца студэнцкая вёска для ўсіх ВНУ са сваім сэрвісным цэнтрам. Наш інтэрнат на 1030 месцаў размесціцца крыху наводдаль, бліжэй да самога праспекта. Тут прадугледжаны двухмясцовыя пакоі з мінікухнямі і санвузламі. Акрамя таго, робім капітальны рамонт "сямёркі" па вул. Кастрычніцкай. У дадзены час дэмантуюцца электраправодкі.

Хутка прыступім да спартыўнай залы ў Шчомысліцах. Гэта будзе паветрана-апорнае збудаванне надуўнога тыпу. Першаснай часткай канструкцыі будзе кампрэсар, які прызваны падтрымліваць належны ціск. У спартзале прадугледжаны распранальні і душавыя.

Таксама сёння шукаюцца інвестары для будаўніцтва корпуса сацыяльна-культурнага прызначэння па вул. Ленінградскай, побач з юрфакам. Тут мяркуецца ўмяшчальная сталоўка, кавярня, рэпетыцыйная зала, адміністрацыйны паверх і г. д.

Як бачыце, работа на бліжэйшыя 10 гадоў у нас ужо распланавана. Чакайце новых будынкаў!

**Гутарыла Ганна ЛАГУН**

## АБ'ЯВЫ

### РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ

**запрашае на павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку ў лютым–сакавіку 2008 г. выкладчыкаў і спецыялістаў устаноў адукацыі па наступных напрамках:**

1. Выкарыстанне пакета "Microsoft Office 2000" у навучальным працэсе і навуковых даследаваннях (для выкладчыкаў, асістэнтаў, навуковых супрацоўнікаў) – 11.02–18.04, 2 разы на тыдзень.

2. Асновы канцэпцыі сучаснага прыродазнаўства (для ПВС, ВНУ, ССНУ) – 18.02–22.02.

3. Працоўная занятасць моладзі ў Рэспубліцы Беларусь: асноўныя тэндэнцыі і перспектывы развіцця студатрадаўскіх рухаў (для арганізатараў студэнцкіх атрадаў і спецыялістаў па сацыяльнай і выхаваўчай рабоце ВНУ) – 18.02–22.02 і 24.03–28.03.

4. Методыка навучання асновам здаровага ладу жыцця (для сацыяльных педагогаў, педагогаў-псіхолагаў, выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) 18.02–29.02.

5. Метадалогія і методыка дысертацыйнага даследавання (для выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў ВНУ, НДІ, навуковых кіраўнікоў аспірантаў і магістрантаў) – 18.02–29.02.

6. Гісторыя і культура Беларусі: новыя падыходы да вывучэння (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ, СШ і інш.) – 24.03–04.04.

7. Кадравы менеджмент у ВНУ (для начальнікаў і інспектараў аддзелаў кадраў ВНУ) – 31.03–04.04.

8. Навукова-тэарэтычныя асновы інавацыйнай дзейнасці (для кіраўнічых работнікаў і спецыялістаў ВНУ) – 31.03–11.04.

**Калі вас зацікавіла наша інфармацыя і вы гатовы браць удзел у курсах, тэлефануйце для папярэдняга запісу ў групы 222-83-03, 200-20-47. Наш адрас: 220007 г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, РІВШ, каб. 320; тел/факс 200-25-51.**

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Рэарганізацыя факультэта журналістыкі ў Інстытут журналістыкі** – інтэрв'ю з дэканам факультэта журналістыкі Сяргеем Дубовікам "Інстытуту журналістыкі быць!" ("Літаратура і мастацтва", 04.01); БелТА (25.01).

**Рэпартаж аб адмене льгот, гутаркі са студэнтамі БГУ** – "Прибитые зайцы" ("Белгазета", 07.01).

**Да 100-годдзя з дня нараджэння Міхася Ларчанкі** – "Выдатны даследчык, незабыўны педагог" ("Літаратура і мастацтва", 11.01).

**Выязны семінар факультэта журналістыкі у Магілёўскі абласны ліцэй № 1, прысвечаны праблеме паляпшэння падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі прафесійных кадраў для рэгіянальных СМІ Магілёўшчыны** – "Прикипеть к газете"("Рэспубліка", 11.01).

**Дзейнасць студэнцкай лабараторыі хімічнага факультэта БДУ** – "Зялёная» хімія, цвёрдае паліва, малекулярная гастраномія..." ("Настаўніцкая газета", 12.01).

**Інтэрв'ю з дырэктарам Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ прафесарам Давідам Ротманам** – "Человек–прогноз" ("Беларусь сегодня", 12.01).

**Правядзенне другога раунда рэпетыцыйнага тэсціравання** – БелТА (15.01, 20.01); tut.by (15.01, 21.01); news.open.by (15.01); akavita.by (15.01); naviny.by (16.01); "Звязда" (16.01); "Рэспубліка" (16.01); "Минск-новости" (17.01); "Минский курьер" (22.01); "Настаўніцкая газета" (22.01).

**Аб стварэнні на базе БДУ Цэнтра аэракасмічнай адукацыі** – "Запуск універсітэцкіх спадарожнікаў – справа часу" ("Настаўніцкая газета", 15.01); БелТА (29.01).

**Распрацоўкі лабараторыі НДІ ФХП БДУ пад кіраўніцтвам Дзмітрыя Грышпана** – "Кому нужен уголь от hi-tech?" ("Рэспубліка", 18.01).

**Узвядзенне будынка па вул. Кальварыйскай** – "Наваселле журфака" ("Настаўніцкая газета", 19.01).

**Аб уздеянні кампутараў на псіхіку моладзі** – "Там есть все – уважение, деньги и слава" ("Рэспубліка", 22.01).

**Рэспубліканская нарада па пытаннях рэформы школы, выступленне рэктара БДУ Васіля Стражава** ("Звязда", 22.01).

**Ушанаванне студэнтаў БДУ – лаўрэатаў і стыпендыятаў Спецыяльнага фонду Прэзідэнта РБ па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў** – БелТА (23.01, 25.01); "Минск-новости" (24.01).

**Інтэрв'ю з рэктарам БДУ Васілём Стражавым** – "Флагман не меняет курса?" ("Народная газета", 24.01).

**Размеркаванне выпускнікоў** – "Из студента – в молодые специалисты. Легко!" ("Рэспубліка", 25.01).

**"Новы прэпарат для лячэння рака працягваюць даследаваць вучоныя БДУ"** ("Настаўніцкая газета", 26.01).

**Пра аднаго з арганізатараў хімічнага факультэта БДУ Мікалая Прылежаева, а таксама матэрыялы, якія тычацца конкурснага адбору і падрыхтоўкі да паступлення ў Ліцэй БДУ (заданні па фізіцы)** – "Репетитор" № 1, 2008.

*Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

*Еровенко В.А.* **Основы высшей математики для филологов: методические замечания и примеры.** Курс лекцый па асновах вышэйшай матэматыкі прызначаны для студэнтаў-філолагаў класічнага універсітэта, якія вывучаюць асновы вышэйшай матэматыкі на працягу аднаго семестра. Складаецца з уводзінаў "Матэматыка ў філалагічнай адукацыі", раздзелаў "Элементы тэорыі мностваў", "Камбінаторыка і верагоднасць" і дадатку "Верагоднасць выпадковага здарэння". У кнізе, арыентаванай на сучасныя стандарты універсітэцкай матэматычнай адукацыі гуманітарыяў, прыводзіцца вялікая колькасць матэматычных прыкладаў і задач з лінгвістычным зместам.

*Ньюмен Дж.Г.* **Идея Университета.**




Пераклад на рускую мову кнігі Дж. Г. Ньюмэна "Ідэя Універсітэта" ("The Idea of a University") працягвае серыю, прысвечаную развіццю універсітэцкай адукацыі. Адной з асноватворных ідэй гэтай работы з'яўляецца ўсебаковае актуальнае абгрунтаванне місіі універсітэта – сцвярджэнне адзінства чалавецтва.

*Козак К.И.* **Германский оккупационный режим на территории Беларуси. 1941-1944 гг.: историография и источники.** Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі аналізуецца не толькі айчынная і замежная літаратура, але і дакументальныя крыніцы з архіваў Германіі, Расіі, Польшчы, Францыі аб германскім акупацыйным рэжыме на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг.

**Наука и инновации в БГУ.** Прадстаўлена інфармацыя пра навуковую і навукова-інавацыйную дзейнасць Беларускага дзяржаўнага універсітэта: сучасная структурная арганізацыя БДУ і яго падраздзяленняў, навукова-кадравы склад, асноўныя напрамкі навуковай і вытворчай дзейнасці, унікальнае абсталяванне, асноўныя дасягненні ў навуковай і інавацыйнай сферах, міжнароднае супрацоўніцтва, звесткі аб асноўных публікацыях.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы**

## ВЕДАЙ НАШЫХ!

# "СПАДЗЯВАНЫ" СЮРПРЫЗ

***Студэнтка гістарычнага факультэта Алена АЛАДКА стала першай віцэ-міс прэстыжнага міжнароднага конкурсу "Топ-мадэль свету", фінал якога адбыўся 18 студзеня ў Хургадзе (Егіпет).***

За галоўны тытул змагаліся дзяўчаты больш чым з 40 краін. Па выніках дэфіле ў вячэрніх суkenках і купальніках журы прысудзіла перамогу Алесандры Алорэс з Германіі, якая на паверку аказалася ўраджэнкай Украіны Аляксандрай Вадзянікавай. Першай віцэ-міс стала наша суайчынніца, другой – Лобна Амін з Егіпта.

"Мы не сумняваліся, што ў Алены добрыя шанцы заняць прызавыя месцы на гэтым конкурсе, – адзначыла кіраўнік Нацыянальнай школы прыгажосці Вольга Сярожнікава. – Як мадэль яна вельмі запатрабаваная, пастаянна ездзіць у Маскву на паказы і здымкі. А яе ўдзел у конкурсе "Топ-мадэль свету" мы не афішавалі, каб зрабіць сюрпрыз. І, як бачыце, ён атрымаўся!"

Алесандры Алорэс у якасці прыза ўручылі сертыфікат на трохтыднёвае падарожжа ў Тайланд, а таксама кантракт на суму 10 тыс. даляраў ЗША.

Алене Аладка дасталіся 3 тыс. даляраў, тыдзень адпачынку ў атэлі Хургады, дзе і праходзіў конкурс, а таксама ювелірныя ўпрыгожанні з жэмчугам, якія, дарэчы, яна велікадушна падаравала дзвюм сястрычкам з расійскага Яраслаўля – дзесяцігадовай Яўгеніі і шасцігадовай Ганне, якія актыўна балелі за Алену падчас конкурсу.

Цікава, што, як гэта часам бывае ў шчаслівых выпадках, удзел нашай дзяўчыны суправаджаўся рознымі прыгодамі. Так, з-за праблем з выдачай візы Алена мусіла прапусціць 10-дзённы падрыхтоўчы этап з насычанай культурнай праграмай, частка якога прайшла ў Каіры, і патрапіла літаральна з карабля на баль.

"Апошнія тры дні занялі 12-гадзінныя рэпетыцыі з перапынкамі па 10 хвілін праз тры гадзіны, – распавяла Алена Аладка. – Але ніхто з дзяўчын не скардзіўся, бо ўсе мы звыклыя да такога графіку. А сам конкурс праводзіўся на вельмі высокім узроўні. Прысутнічалі прадстаўнікі прэсы з 27-мі краін свету! Мне падалося, што на конкурсе "Міс свету", акрамя фінальнага шоу, журналістаў было значна менш".




*Пераможцы конкурсу Алена Аладка (злева) і Алесандра Алорэс.*

На думку віцэ-топ-мадэлі свету, перамагчы ёй дапамагла нестандартная мадэльная знешнасць, добрае веданне замежнай мовы, камунікабельнасць, бесканфліктнасць і наяўнасць добрага партфоліа: "Адзін з маіх здымкаў, зроблены Дзянісам Аргерам, быў надрукаваны ў якасці галоўнага на ўсіх буклетах і афішах. Праўда, не абышлося без казусу – подпіс пад здымкам паставілі "Russia", замест "Belarus". Увогуле, шмат што на гэтым конкурсе адбывалася не так, як трэба: я прыехала са спазненнем, калі ўсе прэс-канферэнцыі скончыліся; у мяне адной не было нацыянальнага дырэктара – чалавека, які прадстаўляе інтарэсы канкурсанткі; і да фіналу мне не давалі стужкі з надпісам краіны... Мая перамога здарылася проці ўсіх нягод і недарэчнасцяў".

Алене Аладка 22 гады. Яна вучыцца на пятым курсе гістфака БДУ. У 15-гадовым узросце патрапіла ў фінал міжнароднага конкурсу "Elite Model Look 2001" у Маскве. У 2003 г. стала аблічкам сотавага аператара "Velcom". У 2004 г. на Нацыянальным конкурсе прыгажосці заваявала тытул "Міс фота". Алена пастаянна ўдзельнічае ў "Тыдні моды" ў Маскве, рэкламуе вядомыя брэнды. Прадстаўляла Беларусь на міжнародным конкурсе "Міс свету 2007". Параметры беларускай мадэлі: 86–60–89, рост – 178 см.

Міжнародны конкурс "Топ-мадэль свету" ладзіцца з 1993 г. Найчасцей (тройчы) пераможцамі ў ім станавіліся дзяўчаты з Германіі. Беларусь у гэтым мерапрыемстве ўдзельнічала ўпершыню.

**Настасся ЮДЧЫЦ**

## У ВОЛЬНЫ ЧАС

***Падчас зімовых вакацый больш за 100 студэнтаў alma mater мелі магчымасць адпачыць у спартыўна-аздараўляльным комплексе "Брыганціна", які вось ужо некалькі гадоў дорыць навучэнцам бадзёрасць і добры настрой, дапамагае аднавіць сілы пасля здачы сесіі.***

# ДОБРЫ АДПАЧЫНАК – ЗАКЛАД ПАСПЯХОВАЙ ВУЧОБЫ

Сёлета кошт пуцёўкі для студэнтаў склаў 45 тыс. руб., астатнюю частку аплаціў універсітэт і прафсаюзны камітэт студэнтаў БДУ.

Каб адпачынак прайшоў цікава, у праграму былі ўключаны спартыўныя мерапрыемствы: валейбол, баскетбол, настольны тэніс, плаванне, більярд і, канешне ж, лыжы, на якія нельга забыцца, калі ляжыць снег і шчыпае марозік. Нядзіўна, што тут жа займаецца універсітэцкая каманда лыжнікаў.

Хоць на вуліцы па-зімоваму холадна, у пакоях "Брыганціны" цёпла. З-за адчыненых дзвярэй часцяком можна пачуць музыку, песні – словам, адпачываецца выдатна!

Пазнавальнай і карыснай стала сустрэча студэнтаў з намеснікам старшыні Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі Раманам Дапірам. У гутарцы закраналіся пытанні сацыяльнай абароны моладзі ў сучасных умовах, вынікі рэформы і ўпарадкавання льгот, а таксама абмяркоўвалася роля моладзі ў партнёрстве паміж дзяржавай і грамадствам у справе ўмацавання сацыяльнага дабрабыту.

Супрацоўнікі Псіхалагічнай службы БДУ прыклалі ўсе намаганні, каб зрабіць адпачынак насычаным і вясёлым. Праведзеныя імі трэнінгі карысталіся вялікай папулярнасцю і па наведванні маглі параўнацца хіба толькі з дыскатэкамі. Так што па вяртанні ўсе, хто абраў месцам адпачынку "Брыганціну", назапасіліся радасцю, бадзёрасцю, прыдбалі шмат сяброў. А што пра гэта думаюць самі студэнты? Вось уражанні некаторых з іх.



"Усё вельмі падабаецца: ад паху хвоі да дыскатэкі, што цягнецца да ночы, ад заняткаў спортам да цікавых сустрэч і, канешне ж, прагляды кінафільмаў. Яны тут каштуюць значна менш, чым у Мінску, але хацелася, каб іх дэманстравалі бясплатна" (Таццяна Чумакова, студэнтка журфака).

"Вельмі запомніўся трэнінг "Эфектыўная камунікацыя". Было цікава, весела, і студэнты пасябравалі так моцна, што напрыканцы гульні "Саракаsuccessionожка" здолелі абхітрыць саміх арганізатараў" (Юлія Дзеева, студэнтка журфака).

*"Снег искрится и кружится,*
*И лыжня в лесок бежит.*
*Обуваем лыжи быстро,*
*Снег летает, все кружит.*
*"Бригантина", "Бригантина" –*
*Место сказок и чудес.*
*Воздух чистый и прохладный*
*Манит нас в сосновый лес.*
*"Бригантина", "Бригантина" –*
*Здесь так класно отдыхать.*
*Этот самый лучший отдых*
*Будем долго вспоминать!"*

(Аляксандр Галерка, студэнт геафака, член універсітэцкай каманды лыжнікаў).

**Святлана ДАЛГАНЮК,**
**сектар сацыяльнай работы УВРМ**

## МАЙСТРОЎНЯ

# ПЕСНЯ ПАЛАНІЛА СЛУХАЧОЎ

**Народны хор выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ "Родніца" ажыццявіў гастрольную паездку ў Рэспубліку Польшча пры садзейнічанні Міністэрства замежных спраў і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у рамках міжнароднага культурнага абмену.**



"Родніцу" запрасіла Генеральнае консульства Беларусі ў Беластоку на чале з Міхаілам Аляксейчыкам, якое з 12 па 15 студзеня 2008 года зладзіла ў рэгіёне "Калядныя сустрэчы з Беларуссю" для беларускай дыяспары.

Калектыў "Родніцы" браў удзел у святочных набажэнствах у храме Святога Мікалая і даў канцэрт у Беластоцкім цэнтры праваслаўнай культуры, атрымаўшы пры гэтым самыя шчырыя і сардэчныя словы падзякі ад яго дырэктара Ірэны Трашчоткі.

14 студзеня ў канцэртнай зале Беластоцкай філармоніі адбыўся фестываль, дзе "Родніца" выступіла з цікавай калядproperнай праграмай і літаральна паланіла сэрцы слухачоў. Публіка, дарэчы, была даволі прадстаўнічай: сярод прысутных – паслы Сербіі, Чэхіі, Аўстрыі, Расіі і іншых краін. Зала стоячы апладзіравала самадзейным артыстам. Не чакалі гледачы такога яскравага відовішча. Многім прыйшліся да душы прыгажосць і меладычнасць нашых песень, якія нясуць у сабе беларускі каларыт і нацыянальную адметнасць.

Неўзабаве пасля вяртання "Родніцы" на імя рэктара быў дасланы афіцыйны ліст ад Генеральнага консульства нашай краіны ў Беластоку, Беластоцкага цэнтра праваслаўнай культуры і Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы з шчырай падзякай за тую душэўную асалоду, якую падаравалі сваім суайчыннікам за мяжой удзельнікі хору. У сваю чаргу калектыў "Родніцы" дзякуе ўсім, хто паспрыяў гэтай творчай вандроўцы.

**Таццяна СМОЛЬСКАЯ,**
**салістка хору, выкладчык філалагічнага факультэта**

## З УСМЕШКАЙ

– Паганец ты! Усё жыццё мне сапсаваў! Усю маладосць на цябе загубіла!

– Хопіць размаўляць з дыпломам!

***

Плылі на адным караблі студэнт і дэкан. Карабель разбіўся аб скалы, а іх удвох выкінула на выспу да людаедаў. Прыводзяць няшчасных да важака:

– Што рабіць з імі?

– Студэнта накарміць, напаіць і спаць пакласці, а з гэтым я яшчэ паразмаўляю аб сваім размеркаванні.

***

"Калі яно зялёнае ці курчыцца – гэта біялогія.

Калі смярдзіць – гэта хімія.

Калі не працуе, але жарэ масу энергіі, – гэта фізіка.

Калі ўвогуле ні на што не падобнае – гэта эканоміка". (Даведнік-вызначальнік для студэнтаў усіх устаноў.)

## АБ'ЯВЫ

**ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады**

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ эканомікі і кіравання бізнэсам (2).

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: г. Мінск, вул. Батанічная, 15, аддзел кадраў ДзІКСТа; тэл. 210-01-10.**

**ІНСТЫТУТ БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ БДУ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады**

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ міжнацыянальных камунікацый.

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 4, каб. 505б; тэл. 209-52-94.**

**РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад**

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ маладзевай палітыкі;

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ сучаснага прыродазнаўства.

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220001, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, аддзел кадраў, каб. 215; тэл. 200-91-07.**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 30 жніўня 2005 года

6 лютага 2008 года
Падпісана да друку 04.02.2008 г.
Зак. 70. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by